**ФАЛЮТЫ́НСКІ** Казімір, фальклярыст, этнограф 19 ст. Ураджэнец Віцебшчыны. Запісваў узоры вусна-паэтычнай творчасці ў ваколіцах Віцебска, Полацка, Лепеля, Суража і інш. Яго назіранні і запісы ляглі ў аснову працы «Народныя святы, увесяленні, павер'і і забабонныя абрады жыхароў Беларусі» (1828), надрукаванай у часопісе «Вестник Европы». У ёй Ф. паказаў багацце нар. паэзіі жыхароў Падзвіння, адзначыў глыбіню яе зместу і асаблівасці мастацкай формы. Разгледзеў асобныя раздзелы сямейнай абраднасці. Апісаў звычаі на розных этапах Вяселля, віншавальныя пажаданні гасцей. Відаць, з-за патрабаванняў часопіса перакласці матэрыялы на рус. мову, не ўключыў у публікацыю ўласныя запісы вясельных песень, а толькі выказаў свае ўражанні ад іх тэкстаў. Закрануў тэму ўшанавання нябожчыкаў, даў кароткія звесткі пра Радаўніцу, Памінкі. Сярод каляндарных абрадаў і звычаяў апісаў Каляды, Вялікдзень, Запашкі, Купалле, Зажынкі, Дажынкі, Увозкі, Акладзіны, Талаку і інш. фрагменты земляробчага цыкла бел. селяніна. Прыведзеныя Ф. запісы не заўсёды адзначаліся дакладнасцю і былі пазбаўлены пашпартызацыі, што тлумачылася недасканалым узроўнем навуковых патрабаванняў усёй фальклярыстыкі 19 ст.

*Літ.*: Каханоўскі Г.А., Малаш Л.А., Цвірка К.А. Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму. Мн., 1989. С. 67—68.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ